# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2024 года*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**11 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.**

| Транскрыпцыя | Правільна |
|---|---|
| [б’эз’л’іч_стэрыйатыпаў] *безліч стэрэатыпаў* | [б’эз’л’іч_стэрэатыпаў] |
| [інжэн’эрнайэ_збудаван’:э] *інжынернае збудаванне* | [інжын’эрнайэ_збудаван’:э] |
| [з’м’эшаныйа_карэн’чык’і] *змешаныя карэньчыкі* | + |
| [доўγачасовайа_п’эрс’п’эктыва] *доўгачасовая перспектыва* | + |
| [аранжэрэйны_жэн’шэн’] *аранжарэйны жэньшэнь* | [аранжарэйны_жэн’шэн’] |
| [з’эрн’эўборачны_аγрэγат] *зернеўборачны агрэгат* | + |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 2.**

| | Значэнне слова | Магчымыя прыклады |
|---|---|---|
| 1 | Даступны для ўсіх | ***адкрыты сход*** |
| 2 | Нічым не адгароджаны, не заслонены, свабодны для агляду | ***адкрытая мясцовасць*; *адкрыты бераг*** |
| 3 | Без покрыву зверху, з бакоў | ***ехаць у машыне з адкрытым верхам*; *адкрытая сцэна*** |
| 4 | Нічым не прыкрыты, аголены | ***хадзіць з адкрытай галавой, з адкрытай шыяй*** |
| 5 | Не замаскіраваны, не тайны, яўны | ***адкрытая сутычка, спрэчка*; *адкрыты канфлікт*** |
| 6 | З вялікім выразам | ***адкрытая сукенка*; *адкрытыя туфлі*** |

*За кожны правільны прыклад – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| | | |
|---|---|---|
| *класці* | ‘плаціць тут жа, не адкладаючы’ | ***класці на бочку*** |
| *круціць* | ‘надакучліва гаварыць адно і тое ж’ | ***круціць катрынку*** |
| *ляжаць* | ‘заставацца без увагі, без нагляду, рэалізацыі’ | ***ляжаць пад сукном*** |
| *набіваць* | ‘накопліваць, не пускаючы ў абарот, трымаючы дома. Пра грошы’ | ***набіваць панчоху*** |
| *надзяваць* | ‘падпарадкоўваць сваёй волі, стрымліваць, утаймоўваць каго-н.’ | ***надзяваць аброць*** |
| *плyваць* | ‘зусім нічога не рабіць, гультаяваць’ | ***плываць у столь*** |

*За кожны правільна складзены фразеалагізм – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| **Словы, якія не маюць канчатка** | **Словы з нулявым канчаткам** | **Словы з матэрыяльна выражаным канчаткам** | **Словы з двума канчаткамі (у тым ліку нулявымі)** |
|---|---|---|---|
| *падвоіць* | *джаз-□* | *ч-ым-сьці* | *с-ёй-т-ой* |
| *сціпла* | *пайшоў-□* | *[й-о]ю* | *восем-□-дзесят-□* |
| *кудысьці* | | *пен-я* | |
| | | *васьмідзясят-ы* | |
| | | *пасляслоў[й-э]* | |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 0,5 бала.*

**Заданне 5.**

| **Назоўнік** | **Прыметнік** | **Назоўнік** | **Прыметнік** |
|---|---|---|---|
| *Копысь* | ***копыскі*** | *Ганцавічы* | ***ганцавіцкі*** |
| *Гарадок* | ***гарадоцкі*** | *Азярцы* | ***азярэцкі*** |
| *Мядзел* | ***мядзельскі*** | *Наваельня* | ***наваельненскі*** |
| *Радунь* | ***радунскі*** | *Бягомль* | ***бягомльскі*** |
| *Круглае* | ***круглянскі*** | *Корнадзь* | ***корнадскі*** |
| *Высокае* | ***высокаўскі*** | *Бердаўка* | ***бердаўскі*** |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 6.**

| **Сказ** | **Тып памылкі (у выпадку яе наяўнасці)** | **Выпраўлены варыянт (магчымыя варыянты)** |
|---|---|---|
| А | Плеаназм | ***Было адзначана, што вакцына ёсць.*** |
| Б | Таўталогія | ***Для абітурыентаў 2023 года зроблены цікавыя нававўядзенні.*** |
| В | Плеаназм | ***Ансамбль вельмі добра выконваў фальклорныя песні.*** |
| Г | Няма памылкі | ***У кожным лагеры для дзяцей падрыхтавалі розныя забаўляльныя і адукацыйныя праграмы.*** |
| Д | Неразмежаванне паронімаў | ***Моладзь ва ўсе часы была дзейнай.*** |
| Е | Таўталогія | ***Значэнне Беларускай АЭС для энергетычнай бяспекі нашай краіны проста велізарнае.*** |

*За кожнае правільнае вызначэнне тыпу памылкі – 0,5 бала, за кожнае правільнае выпраўленне памылкі – 0,5 бала. За правільнае вызначэнне адсутнасці памылкі – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Пад вечар лісіца *(ліса)* залягла побач з тэлеграфнай лініяй *(каля тэлеграфнай лініі)* на дне раўка, у густым і высокім астраўку сухастойнага конскага шчаўя і, скруціўшыся *(скурчыўшыся)* руда-палевым *(рыжа-палевым)* камяком *(камячком)* каля цёмна-чырвоных густых сцёблаў, цярпліва чакала ночы, нервова стрыгучы вушамі, пастаянна прыслухоўваючыся да тонкага посвісту ветру ў шаматлівых мёртвых травах. Тэлеграфныя слупы таксама нудна гулі. Ліса, аднак, іх не баялася. Слупы заўсёды застаюцца на месцы, яны не могуць пераследаваць *(праследаваць, гнацца за табой)*.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| А | **Апавяданне** | **Раман** | **Аповесць** |
|---|---|---|---|
| **Б** | «Літоўскі хутарок» Максіма Гарэцкага | «Людзі на балоце» Івана Мележа | «У палескай глушы» Якуба Коласа |
| **В** | **1, 2, 3, 5, 6, 8, 9, 10** | **4** | **7, 11** |

*За правільна запоўнены радок А – 0,5 бала, за кожнае правільнае вызначэнне жанру пералічаных твораў – 0,5 бала.*

**Заданне 9.**

| Аўтар | Назва твора | Персанаж | Характарыстыка персанажа |
|---|---|---|---|
| Васіль Быкаў | **«Знак бяды»** | **Патап Каландзёнак** | Ён праяўляў «класавую пільнасць»: пісаў даносы на аднавяскоўцаў і пасылаў іх у раённую газету. Па адным такім паклёпніцкім даносе была раскулачана сям’я Ладзімера Багацькі |
| **Янка Купала** | **«Раскіданае гняздо»** | Сымон Зяблік | Увасабляе маладое пакаленне. Ён бунтар спачатку стыхійны, а потым ідэйны. Здольны на адчайныя ўчынкі |
| Уладзімір Караткевіч | **«Дзікае паляванне караля Стаха»** | **Дубатоўк** | Ён гуляў у захавальніка шляхецкіх традыцый, быццам абараняў сваячніцу. Але на працягу дзеяння твора высвятляецца, што за маскай хаваецца хітры і бязлітасны чалавек, які задумаў загубіць род сваякоў, каб займець іх замак і маёмасць |
| **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч** | **«Пінская шляхта»** | Кручкоў | Гэта станавы прыстаў, які бессаромна абірае запалоханых людзей. Палешукі называюць яго «найяснейшая карона» |
| Якуб Колас | **«Новая зямля»** | **Антось** | Дбайны і акуратны гаспадар. Вясёлы і дасціпны жартаўнік, умее прызнаваць памылкі. Добры жыццёвы настаўнік для дзяцей свайго брата. Уласнай сям’і не мае |
| **Іван Шамякін** | «Сэрца на далоні» | **медсястра Маша** | Яна пакутуе ад кахання спачатку да доктара, а потым захапляецца яго прыёмным сынам і яшчэ адным маладым чалавекам, які таксама ёй захапляўся і ледзь не загінуў. У фінале рамана дзяўчына на раздарожжы: каго выбраць у спадарожнікі жыцця |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку –0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Агульная ацэнка за выкананне задання складаецца з двух кампанентаў: ацэнкі за аргументацыю спалучэння карціны з вершам і ацэнкі назвы, анатацыі.*

*За кожны аргумент з доказамі (напрыклад, агульнасць вобразаў: у вершы і на карціне ўвасоблены вобраз дарогі; агульнасць часу стварэння твораў: другая палова XX стагоддзя; агульны настрой: і мастак, і паэт адлюстроўваюць настальгію па родным куточку; іншыя) – 1 бал. Максімальная колькасць балаў па гэтым кампаненце – 3. Не прымаюцца аргументы без доказаў і аднолькавыя па сваёй сутнасці.*

*Назва і анатацыя ацэньваюцца наступным чынам:*

| *Колькасць балаў* | *Рэкамендацыі па ацэньванні* |
|---|---|
| 3 | *Прыведзена арыгінальная назва альбома, якая абыгрываецца ў анатацыі. У анатацыі названы мэта стварэння альбома і адрасат. Памер анатацыі з'яўляецца аптымальным* |
| 2 | *Прыведзена арыгінальная назва альбома, якая не абыгрываецца ў анатацыі. У анатацыі названы мэта стварэння альбома і адрасат. Памер анатацыі з'яўляецца аптымальным*<br>*АБО*<br>*Прыведзена арыгінальная назва альбома, якая абыгрываецца ў анатацыі. У анатацыі не названы мэта стварэння альбома або адрасат. Памер анатацыі з'яўляецца аптымальным* |
| 1 | *Прыведзена арыгінальная назва альбома, якая не абыгрываецца ў анатацыі. У анатацыі не названы мэта стварэння альбома або адрасат.*<br>*Памер анатацыі не ўлічваецца* |
| 0 | *Прыведзена назва альбома, якая не абыгрываецца ў анатацыі. У анатацыі не названы мэта стварэння альбома і адрасат. Памер анатацыі не ўлічваецца*<br>*АБО*<br>*Адсутнічае назва ці анатацыя*<br>*АБО*<br>*Адказ адсутнічае* |